**А. В. ДОЎГАЛЬ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова

# ВУЧЭБНА-ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ЗАДАННІ ПА ТЭМЕ «ГУКІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

**Прапанаваныя практыкаванні па тэме «Гукі беларускай мовы» распрацаваны з мэтай удасканальвання і павышэння ўзроўню ведаў навучэнцаў аб гукавым ладзе беларускай мовы. Іх можна выкарыстоўваць для работы з адоранымі дзецьмі пры падрыхтоўцы да алімпіяды, многія практыкаванні будуць прыдатныя на ўроках беларускай мовы ў якасці практычнага матэрыялу. Акрамя вырашэння адукацыйнай мэты, практыкаванні скіраваны на развіццё ў вучняў уважлівасці, кемлівасці і цікаўнасці. Заданні прайшлі апрабацыю на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў Магілёўскім дзяржаўным абласным інстытуце развіцця адукацыі.**

**1.** Дапішыце неабходную інфармацыю.

Фанетыка — гэта раздзел беларускай мовы, у якім вывучаюцца ____________, ____________, ____________, ________________. Асобнымі раздзеламі фанетыкі з'яўляюцца ______________ (навука аб націску), ____________ (навука пра інтанацыю) і ____________ (навука пра склад і складападзел). Асноўнай фанетычнай адзінкай з'яўляецца ____________. У беларускай мове ______ гукаў. З іх ______ галосных і ______ зычных. Паколькі зычных значна больш, чым галосных, то беларуская мова адносіцца да ____________ тыпу моў. Літара ______ не мае гукавога значэння. Рух органаў маўлення пры вымаўленні гукаў называецца ________________________________________.

**2.** Якое азначэнне адпавядае тэрміну «гук»?

1) Найменшая структурная частка слова, якая выражае пэўнае лексічнае або граматычнае значэнне;
2) найменшая адзінка маўлення, якая ўтвараецца органамі маўлення за адну артыкуляцыю;
3) найменшая маўленчая адзінка, якая мае націск;
4) пісьмовы знак алфавіта.

**3.** У гукаў беларускай мовы наваселле! Ім пабудавалі новы дом, у якім ёсць адна-, двух- і чатырохпакаёвыя кватэры. Рассяліце гукі так, каб ніводзін не застаўся бесхацінцам.



4. Запоўніце табліцу.

| № | Заданне | Адказ |
|---|---|---|
| 1. | Назавіце галосныя гукі. | |
| 2. | Назавіце санорныя парныя гукі. | |
| 3. | Назавіце заўсёды цвёрды гук, які не з'яўляецца зацвярдзелым. | |
| 4. | Назавіце парны мяккі для гука [д]. | |
| 5. | Назавіце парны цвёрды для гука [ц']. | |
| 6. | Назавіце парны глухі для гука [дж]. | |
| 7. | Назавіце парны звонкі для гука [ц]. | |
| 8. | Назавіце парны звонкі для гука [х]. | |
| 9. | Назавіце парны звонкі для гука [к]. | |
| 10. | Назавіце гукі беларускай мовы, якіх няма ў рускай. | |

5. Рашыце фанетычныя прапорцыі:

[з] — [ж] : [ ] — [ш];
[в] — [в'] : [ ] — [ц'];
[л] — [л'] : [д] — [ ];
[ж] — [ш] : [дз] — [ ];
[б'] — [п'] : [ґ']* — [ ];
[т] — [ч] : [д] — [ ];
[к] — [х] : [ ] — [г];
[з] — [дз] : [ ] — [дж].

6. Якімі гукамі адрозніваюцца словы?

Магніт — магнат, кефір — зефір, яд — ёд, часта — чыста, маяк — марак, падмяніць — падмануць, вязем — вязём, дагавор — нагавор, кот — ток, род — рот, пастэль — пасцель, галасы — галасі, смехам — з мехам, соль — лось, парог — пірог, несці — везці, сыр — рыс, рыс — рысь, лоб — бал, ёлка — золка, вуж — вус, мёд — медзь, куфар — факір, сіла — ліса, лыжы — лужы, крыўда — коўдра, амплуа — ампула, дзянёк — цянёк, газа — ваза.

7. Якімі гукамі адрозніваюцца словы беларускай і рускай моў?

| Словы | Гукі |
|---|---|
| кроў — кровь | |
| Дар'я — Дарья | |
| дождж — дождь | |
| здача — сдача | |
| рог — рог | |
| госць — гость | |
| свацц累 — сватья | |
| шырыня — ширина | |
| дзверы — двери | |
| з імі — с ними | |
| п'ю — пью | |
| не так — не так | |
| зелле — зелье | |
| іскра — искра | |

* [ґ] — выбухны, [г] — фрыкатыўны.

8. Прачытайце выразна ўрывак з верша М. Багдановіча «Зімой». Які радок на слых падаецца самым «звонкім», а які — самым «глухім»? Праверце сваю здагадку, падлічыўшы колькасць глухіх і колькасць звонкіх зычных у кожным радку (санорныя лічыце як звонкія).

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

9. У якіх лічэбніках першага дзясятка беларускай і рускай моў назіраюцца найбольшыя гукавыя адрозненні?

10. У якіх з прыведзеных слоў вымаўляецца гук [с']?

Шчасце, усялякі, скіраваць, злуешся, смех, схема, ганаруся, скрозь, рассекчы, распесціць, подпіс, ледзь, летась, моладзь, калісьці.

11. У якіх словах вымаўляецца гук [ш]?

Шчасце, сшытак, возчык, крыж, парыжскі, шаша, дождж, чэшскі, міраж, расшыць, мыш, лыжка, злуешся, вырошчваць, лепшы.

12. Падкрэсліце словы, у якіх вымаўляецца выбухны [ґ]. Патлумачце іх значэнне. Запішыце іх у форме роднага склону.

Агрэст, газета, гільдыя, гарсэт, гандаль, гвалт, гоман, габелен, галёш, газа, гузік, галіфэ, гамак, гонта, гейша, гарнец, кеглі, мязга, цагельня, швагер, фігура, экзамен, легенда, ганьба, зігзаг.

13. У якім слове з прыведзеных ніжэй няма прыстаўнога гука? Патлумачце свой адказ.

Гэты, гісторыя, імгненне, аржаны, вучань, востраў, яна.

14. Вызначце чацвёртае лішняе слова і абгрунтуйце свой адказ:

1) возера, вока, волас, воблака;
2) спяваць, схіляць, распісаць, усцешыць;
3) елка, здароўе, кар'ера, лесвіца;
4) Навум, Лявон, Давыд, Тадэвуш;
5) ігліца, імша, ільготны, іржа.

15. Якія словы атрымаюцца, калі:

1) словы *мароз, яр, ёд, муж, соль* вымавіць у адваротным парадку;
2) у словах *густа, дата, болька, голад, золь, дзеканне* першы зычны вымавіць без удзелу голасу;

3) у словах *быў, байка, бедны, булка, дагавор, дзіва, дуда, дагары́* першы зычны вымавіць праз насавую поласць;

4) у словах *тук, бэз, баліць, выць, тыкаць, лапаць, пыльны* першы зычны вымавіць як мяккі?

**16.** Якія гукі могуць абазначаць прыведзеныя літары? Запоўніце табліцу.

| Літары | Гукі | Прыклады слоў |
|---|---|---|
| г | | |
| з | | |
| е | | |

**17.** У «Буквары» Анатоля Клышкі для абазначэння зычных гукаў выкарыстоўваюцца два сімвалы: ⌒ı ——. Здагадайцеся, якія гукі абазначаюцца гэтымі знакамі. Патлумачце сваю думку.

**18.** Чалавек жыве ў свеце гукаў. Гукі якіх жывых істот мы называем наступнымі дзеясловамі?

брахаць — ______________
бзыкаць — ______________
каркаць — ______________
рохкаць — ______________
пішчаць — ______________
гаргатаць — ______________
іржаць — ______________
выць — ______________
трубіць — ______________
стракатаць — ______________
квахтаць — ______________
шчабятаць — ______________
варкатаць — ______________
сакатаць — ______________
курлыкаць — ______________
клекатаць — ______________
зумкаць — ______________
кугакаць — ______________
бляяць — ______________
ціўкаць — ______________

Успомніце іншыя дзеясловы, якія абазначаюць гукі жывёл і птушак.

______________________________________________

**19.** У беларускай мове цэлы шэраг абрэвіятур утвораны з пачатковых гукаў зыходных слоў. Запішыце гэтыя абрэвіятуры літарамі і расшыфруйце іх.

[мас], [йэ́шка], [закс], [аэс], [цэс], [нан], [с′ніт], [с′м′і], [ц′ух], [рыўш].

**20.** Растлумачце значэнне фразеалагізмаў. Знайдзіце ў іх фанетычныя адметнасці беларускай мовы. Адказ аформіце ў табліцы.

| № п/п | Фразеалагізм | Значэнне | Фанетычныя асаблівасці |
|---|---|---|---|
| 1 | бочка арыштантаў | | |
| 2 | у імгненне вока | | |
| 3 | падразаць крылле | | |
| 4 | на чатыры вокі | | |
| 5 | у гарачай вадзе купаны | | |

## Адказы і каментарыі

1. Фанетыка — гэта раздзел беларускай мовы, у якім вывучаюцца *гукі, склады, націск, інтанацыя*. Асобнымі раздзеламі фанетыкі з'яўляюцца *акцэнталогія* (навука аб націску), *інтаналогія* (навука пра інтанацыю) і *сілабіка* (навука пра склад і складападзел). Асноўнай фанетычнай адзінкай з'яўляецца *гук*. У беларускай мове *45* гукаў. З іх *6* галосных і *39* зычных. Паколькі зычных значна больш, чым галосных, то беларуская мова адносіцца да *вакалічнага* тыпу моў. Літара ь не мае гукавога значэння. Рух органаў маўлення пры вымаўленні гукаў называецца *артыкуляцыяй*.

2. Правільны адказ — 2.

3. Для выканання задання можна даць малюнак шматпавярховага дома з дакладнай колькасцю кватэр. Можна прапанаваць намаляваць дом і адпаведныя кватэры з гукамі. У аднапакаёвыя кватэры (першы паверх на малюнку) засяляюцца галосныя: [а], [о], [у], [э], [і], [ы]. Таксама ў аднапакаёвых (другі паверх) размяшчаюцца санорныя няпарныя гукі: [р], [й], [ў]. У двухпакаёвых кватэрах (трэці і чацвёрты паверхі) будуць жыць зычныя, парныя па адной прымеце (звонкасць / глухасць або цвёрдасць / мяккасць): [м] — [м'], [н] — [н'], [л] — [л'], [в] — [в'], [ф] — [ф'], [ж] — [ш], [дж] — [ч], [дз] — [ц]. Тут варта звярнуць увагу на зычныя [в] — [в'], [ф] — [ф'], якія ў беларускай мове не ўтвараюць паміж сабой пары па звонкасці / глухасці. У чатырохпакаёвыя кватэры (пяты і шосты паверхі) засяляцца зычныя, парныя паміж сабой па звонкасці / глухасці і цвёрдасці / мяккасці: [д], [т] — [дз'], [ц']; [б], [п] — [б'], [п']; [з], [с] — [з'], [с']; [г], [х] — [г'], [х']; выбухны [ґ], [к] — выбухны [ґ'], [к']. Цяжкім для вучняў можа быць пошук апошняй чацвёркі, бо часта мы забываемся на выбухныя [ґ] — [ґ'].

4.

| № | Заданне | Адказ |
|---|---|---|
| 1. | Назавіце галосныя гукі. | [а], [о], [у], [э], [і], [ы] |
| 2. | Назавіце санорныя парныя гукі. | [м] — [м'], [н] — [н'], [л] — [л'], [в] — [в'] |
| 3. | Назавіце заўсёды цвёрды гук, які не з'яўляецца зацвярдзелым. | [ў] |
| 4. | Назавіце парны мяккі для гука [д]. | [дз'] |
| 5. | Назавіце парны цвёрды для гука [ц']. | [т] |
| 6. | Назавіце парны глухі для гука [дж]. | [ч] |
| 7. | Назавіце парны звонкі для гука [ц]. | [дз] |
| 8. | Назавіце парны звонкі для гука [х]. | [г] |
| 9. | Назавіце парны звонкі для гука [к]. | [ґ] |
| 10. | Назавіце гукі беларускай мовы, якіх няма ў рускай. | [ў], [г], [г'], [ц'], [дж], [ч], [дз'], [дз] |

5.
[з] — [ж] : [с] — [ш];
[в] — [в'] : [т] — [ц'];
[л] — [л'] : [д] — [дз'];
[ж] — [ш] : [дз] — [ц];
[б'] — [п'] : [г'] — [к'];
[т] — [ч] : [д] — [дж];
[к] — [х] : [ґ] — [г];
[з] — [дз] : [ж] — [дж].

**6.** Словы адрозніваюцца наступнымі гукамі: магніт — магнат ([н'], [і] — [н], [а]), кефір — зефір ([к'] — [з']), яд — ёд ([а] — [о]), часта — чыста ([а] — [ы]), маяк — марак ([й] — [р]), падмяніць — падмануць ([м'], [н'], [і] — [м], [н], [у]), вязем — вязём ([э] — [о]), дагавор — нагавор ([д] — [н]), кот — ток (не адрозніваюцца), род — рот (не адрозніваюцца), пастэль — пасцель ([с], [т] — [с'], [ц']), галасы — галасі ([с], [ы] — [с'], [і]), смехам — з мехам ([с'] — [з']), соль — лось ([с], [л'] — [с'], [л]), парог — пірог ([п], [а] — [п'], [і]), несці — везці ([н'] — [в']), сыр — рыс (не адрозніваюцца), рыс — рысь ([с] — [с']), лоб — бал ([о], [п] — [а], [б]), ёлка — золка ([й] — [з]), вуж — вус ([ш] — [с]), мёд — медзь ([о], [т] — [э], [ц']), куфар — факір ([к], [у] — [к'], [і]), сіла — ліса ([с'], [л] — [с], [л']), лыжы — лужы ([ы] — [у]), крыўда — коўдра ([ы] — [о]), амплуа — ампула (не адрозніваюцца), дзянёк — цянёк ([дз'] — [ц']), газа — ваза ([ґ] выбухны — [в]).

7.

| Словы | Гукі |
|---|---|
| кроў — кровь | [ў] — [ф'] |
| Дар'я — Дарья | [р] — [р'] |
| дождж — дождь | [шч] — долгий [ш'] |
| здача — сдача | [ч] — [ч'] |
| рог — рог | [х] — [к] |
| госць — гость | фрыкатыўны [г] — выбухны [ґ], [ц'] — [т'] |
| сваццargя — сватья | падоўжаны [ц'] — [т'], ø — [й] |

| Словы | Гукі |
|---|---|
| шырыня — ширина | [р] — [р'], [ы] — [и], [н'] — [н] |
| дзверы — двери | [дз'] — [д'], [р] — [р'], [ы] — [и] |
| з імі — с ними | [з'] — [с] або [с'], [й] — [н'] |
| п'ю — пью | [п] — [п'] |
| не так — не так | [а] — [и$^э$] |
| зелле — зелье | падоўжаны [л'] — [л'], ø — [й] |
| іскра — искра | [й] — ø |

**8.** Самым «звонкім» радком з'яўляецца «Здароў, марозны, звонкі вечар!» (13 звонкіх). Самымі «глухімі» радкамі будуць «Здароў, скрыпучы, мяккі снег!» і «Пад сінявой начной стаяць» (па 7 глухіх).

**9.** Найбольшыя гукавыя адрозненні назіраюцца паміж лічэбнікамі «чатыры» і «четыре». Яны адрозніваюцца чатырма гукамі [ч] — [ч'], [а] — [и$^э$], [р] — [р'], [ы] — [э]. Паводле акадэмічнай граматыкі рускай мовы канцавы галосны [э] у лічэбніку «четыре» пры вымаўленні рэдуцыруецца ў гук [ь] (па-руску называецца «ерь»).

**10.** Гук [с'] вымаўляецца ў словах *шчасце, усялякі, смех, ганаруся, скрозь, распесціць, летась, калісьці.*

**11.** Гук [ш] вымаўляецца ў словах *шчасце, возчык, крыж, шаша, дождж, міраж, мыш, лыжка, вырошчваць, лепшы.*

**12.** Выбухны гук [ґ] вымаўляецца ў словах *агрэст, гарсэт, гвалт, газа, гузік, гонта, гарнец, мязга, экзамен.*

Канчаткі формы роднага склону пададзены ў дужках:

- агрэст (-у) — калючая садовая кустовая расліна з кісла-салодкімі буйнымі ягадамі; ягады гэтай расліны;
- гарсэт (-а) — 1) шырокі пругкі пояс для сцягвання таліі; 2) артапедычны пояс, які выкарыстоўваецца пры артапедычных захворваннях; 3) від безрукаўкі;

• газа (-ы) — гаручая вадкасць, якая атрымліваецца пры перапрацоўцы нафты і служыць для асвятлення;

• гвалт (-у) — 1) прымяненне фізічнай сілы да каго-небудзь; 2) прымусовае ўздзеянне на каго-небудзь; 3) крык, лямант; 4) *(выкл.)* кліч аб ратунку;

• гузік (-а) — зашпілька для адзення;

• гонта (-ы) — невялікая дошчачка, востра заструганая з аднаго боку і з пазам з другога, для пакрыцця дахаў;

• марнец (гарца) — 1) старая мера сыпучых рэчываў, роўная 3,28 л; 2) пасудзіна такой ёмістасці;

• мязга (-і) — 1) мяккая частка дрэва, што знаходзіцца паміж карой і драўнінай; 2) маса, якая атрымліваецца пасля расцірання чаго-небудзь;

• швагер (швагра) — 1) брат жонкі; 2) муж сястры ці сястры жонкі;

• экзамен (-у) — 1) праверка ведаў па якім-небудзь прадмеце; 2) выпрабаванне.

**13.** Прыстаўнога гука няма ў слове *гісторыя.* Гэта слова запазычана з грэчаскай мовы (ἱστορία), дзе яно вымаўлялася з пачатковым прыдыхальным гукам, падобным да [х]. У заходнееўрапейскіх мовах гэты пачатковы гук таксама захаваўся: *history* (англ.), *histoire* (франц.), *historia* (ісп.). А ў рускай мове гэты гук страціўся.

**14.** Чацвёртым лішнім з'яўляюцца наступныя словы:

1) *волас* (у гэтым слове няма прыстаўнога [в], а ў астатніх ёсць);

2) *схіляць* (у гэтым слове вымаўляецца гук [с], а ў астатніх [с']);

3) *лесвіца* (у гэтым слове літара *е* абазначае адзін гук [э], а ў астатніх два — [й] і [э]);

4) *Давыд* (у гэтым імені няма ўстаўнога гука [в], а ў астатніх ёсць);

5) *ігліца* (у гэтым слове няма прыстаўнога гука [і], а ў астатніх ёсць).

**15.** Атрымаюцца наступныя словы:

1) сорам, рай, той, шум, лёс;

2) хуста, тата, полька, холад, соль, цеканне;

3) мыў, майка, медны, мулка, нагавор, ніва, нуда, на гары;

4) цюк, без, бяліць, віць, цікаць, ляпаць, пільны.

Варта звярнуць увагу, што ў кожным заданні размова ідзе пра гукі, а не літары, якімі яны запісаны.

**16.**

| Літары | Гукі | Прыклады слоў |
|---|---|---|
| г | [г] | горад, сагрэць |
| | [г'] | Магілёў, геаметрыя |
| | [г] выбухны | ганак, гузік |
| | [г'] выбухны | швагер, гірса |
| | [к] | мозг |
| | [х] | дыялог, снег |
| з | [з] | зорка, гарэза |
| | [з'] | зефір, разбіць |
| | [с] | доказ, нізка |
| | [с'] | дробязь, грызці |
| | [ж] | зжаць, без жалю |
| | [ш] | паказчык, без шапкі |
| е | [э] | лес, поле |
| | [йэ] | ежа, аб'езд |
| | [а] | без голасу, не буду |

**17.** Сімваламі ⌒ і — у «Буквары» абазначаюцца мяккія і цвёрдыя зычныя гукі. Гэтыя сімвалы паказваюць рух языка: пры вымаўленні мяккіх спінка языка выгінаецца ўверх да цвёрдага паднябення, а пры вымаўленні цвёрдых такога руху не адбываецца.

**18.** *Брахаць* — сабака; *бзыкаць* — насякомае; *каркаць* — варона; *рохкаць* — свіння; *пішчаць* — мыш; *гаргатаць* — гусь; *іржаць* — конь; *выць* — воўк, сабака; *трубіць* — лось; *стракатаць* — конік, сарока; *квахтаць* — курыца; *шчабятаць* — птушка; *варкатаць* — кот, голуб; *сакатаць* — сарока; *курлыкаць* — жураўель; *клекатаць* — бусел; *зумкаць* — насякомае; *кугакаць* — сава; *бляяць* — авечка; *ціўкаць* — птушка.

Можна назваць яшчэ такія дзеясловы: *чырыкаць* (верабей), *крумкаць* (жаба), *мяўкаць* (кот), *кукарэкаць* (певень), *ціўкаць* (птушкі), *кукаваць* (зязюля).

**19.** МАЗ (Мінскі аўтамабільны завод), ЕШКА (Еўрапейская школа карэспандэнцкай адукацыі), ЗАГС (запіс актаў грамадзянскага стану), АЭС (атамная электрычная станцыя), ЦЭС (цеплавая электрычная станцыя), НАН (Нацыянальная акадэмія навук), СНІД (сіндром набытага імуннага дэфіцыту), СМІ (сродкі масавай інфармацыі), ТЮГ (тэатр юнага гледача), РІВШ (Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы).

**20.**

| № п/п | Фразеалагізм | Значэнне | Фанетычныя асаблівасці |
|---|---|---|---|
| 1 | бочка арыштантаў | многа | зацвярдзелыя [ч], [р], аканне, [ў] |
| 2 | у імгненне вока | вельмі хутка, імгненна | прыстаўныя [і] і [в], фрыкатыўны [г], падоўжаны [н'] |
| 3 | падразаць крылле | перашкаджаць каму-небудзь дзейнічаць | зацвярдзелы [р], аканне, цеканне, падоўжаны [л'] |
| 4 | на чатыры вокі | без сведак | зацвярдзелыя [ч] і [р], аканне, прыстаўны [в] |
| 5 | у гарачай вадзе купаны | занадта гарачы, запальчывы чалавек | фрыкатыўны [г], аканне, зацвярдзелыя [р] і [ч], дзеканне |